**Д.Н.ДУБІНІНА**
Рэспубліка Беларусь, Мінск, УА «БДПУ імя М.Танка»

## РЫТОРЫКА Ў ДАШКОЛЬНАЙ УСТАНОВЕ: ТЭАРЭТЫЧНЫ І МЕТАДЫЧНЫ АСПЕКТЫ

У тлумачальных слоўніках рыторыка вызначаецца як навука і мастацтва красамоўства, пераканання словам. Па зазначэнні антычных філосафаў, рыторыка – гэта навука аб законах "вынаходніцтва, распалажэння і выражэння думак у маўленні".

Умець добра размаўляць – гэта не толькі ўмець выражаць думкі дакладна і паслядоўна, правільна будаваць граматычныя канструкцыі, але і рабіць свае маўленне выразным, багатым і адпавядаючым сітуацыі зносін. Першасным у дачыненні дзіцяці да духоўных вытокаў мовы з'яўляецца глыбокае адчуванне выразнасці, прыгажосці мастацкага слова і таго мастацкага вобраза, што ствараецца па яго ўплывам.

Пытанні дзейнасці і выразнасі слова, у адпаведнасці з іх прызначэннем, з даўніх гадоў цікавілі чалавека. Ім надавалася асаблівая ўвага на працягу ўсяго гістарычнага жыцця грамадства. Па меры развіцця агульнай і духоўнай культуры ў народзе развівалася і культура маўлення, расло разуменне карыснасці і неабходнасці яснага, чыстага, яркага і выразнага маўлення, так званага "краснага слова". Пацвярджэннем таму з'яўляецца вобразны выраз Сакрата: "Загавары, каб я цябе ўбачыў", які слушна падкрэслівае значнасць мастацтва маўлення ў фарміраванні агульнай культуры чалавека.

Антычнымі філосафамі Арыстоцелем, Квінцііліанам, Цыцэронам была распрацавана тэорыя славеснага выражэння, якая змяшчала вучэнне пра адбор слоў, вучэнне аб спалучэнні слоў і вучэнне аб фігурах (з наступным адрозненнем тропаў і фігур). Па перакананні Цыцэрона, для таго, каб выклікаць захапленне ў слухачоў, недастаткова толькі чыстаты і яснасці маўлення, неабходна яшчэ і прыгажосць маўлення.

Значна пазней вялікі літаратурны крытык В.Г.Бялінскі адзначыў, што ўзровень маўленчай культуры чалавека залежыць не толькі ад ведаў правілаў і строгага іх выканання, але і ад ступені знаёмства з багаццем нацыянальнай мовы, ад умення валодаць гэтым багаццем.

Авалоданне вусным маўленнем – адзін з найбольш значных здабыткаў чалавека. Слова з'яўляецца сродкам зносін паміж людзьмі, спосабам абмену інфармацыяй, інструментам уздзеяння на свядомасць і ўчынкі іншага чалавека. Разам з тым, "дар слова" (моўная здольнасць) выступае як састаўная частка агульнай культуры чалавека, яго адукаванасці, узроўню яго духоўнага развіцця.

Ва ўмовах развіцця сістэмы дашкольнай адукацыі праблема маўленчай культуры і маўленчых зносін з'яўляецца адной з вызначальных. На працягу дашкольнага дзяцінства зносіны з дарослымі набываюць пазасітуацыйны характар. Вызначаюцца дзве пазасітуацыйныя формы зносін з дарослымі – пазасітуацыйна-асобасная і пазасітуацыйна-пазнавальная. Для пазасітуацыйна-пазнавальнай формы характэрны пазнавальныя матывы і патрэба ў павазе дарослага да дзіцяці. Гэтая форма зносін пачынае складвацца ў 4-5 гадоў. У старэйшым дашкольным узросце паяўляецца пазасітуацыйна-асобасная форма зносін. Гэтая форма вызначаецца патрэбай ва ўзаемаразуменні і спачуванні сваімі асобаснымі матывамі зносін. Адзначым, што галоўным сродкам для пазасітуацыйных формаў зносін з'яўляецца маўленне.

У дашкольным узросце дзеці кантактуюць з рознымі суразмоўнікамі: аднагодкамі, дзецьмі малодшага ўзросту, дарослымі, роднымі і блізкімі, знаёмымі і незнаёмымі. Пры гэтым вырашаюцца розныя камунікатыўныя задачы: як прывітацца ці адвітацца; як выразіць просьбу; як размаўляць па тэлефону; што азначае быць уважлівым слухачом; ці існуюць правілы зносін і г.д.

Ад двух да пяці гадоў дзіця авалодвае фанетыкай, асновамі граматыкі, пашыраецца і ўзбагачаецца яго актыўны і пасіўны слоўнікі. Авалоданне дашкольнікамі навыкамі камунікацыі адбываецца стыхійна, у розных відах дзейнасці. Для развіцця маўленчай камунікацыі дзіцяці важнае значэнне маюць пазасітуацыйныя зносіны з дарослымі. Як адзначае А.А.Смірнова, па-першае, у працэсе такіх зносін дзіця асэнсавана засвойвае нормы і правілы паводзін, што спрыяе фарміраванню маральнай свядомасці. Па-другое, праз асобасныя зносіны дзеці вучацца бачыць сябе як бы з боку, што з'яўляецца значнай умовай развіцця самасвядомасці і самакантролю. Па-трэцяе, у асобасных зносінах, дзеці пачынаюць адрозніваць розныя ролі дарослых і ў адпаведнасці з гэтым па-рознаму будаваць свае адносіны з імі, яны авалодваюць пэўнай маўленчай камунікацыяй, якая непасрэдна звязана з роллю, якую выконваюць дашкольнікі. Кваліфікаванае навучанне рыторыцы можна пачынаць, па меркаванні навукоўцаў, у 6-7 гадоў.

Менавіта таму, на факультэтах дашкольнага выхавання мэтазгодна праводзіць спецсемінар па дашкольнай рыторыцы. Ён можа ўключаць сабой цыкл семінарскіх і практычных заняткаў, розныя формы самастойнай работы студэнтаў. Мэтай такога спецсемінара з'яўляецца: авалоданне студэнтам асноўнымі тэарэтычнымі пытаннямі рыторыкі дашкольнікаў, метадамі і прыёмамі адпрацоўкі тэхнікі маўлення выхаванцаў дашкольных устаноў.

З акрэсленай мэты выцякаюць наступныя задачы: знаёмства слухачоў з рыторыкай дзяцей дашкольнага ўзросту, гісторыяй развіцця гэтай навукі; арыентыроўка студэнтаў у асноўных паняццях моўнага і лагічнага аспектаў рыторыкі, этыка і псіхалогіі маўленчых зносін; авалодванне метадамі і прыёмамі адпрацоўкі тэхнікі маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту, фарміравання ў іх эўрыстычных уменняў; аналіз метадычнага забяспячэння дашкольнай падрыхтоўкі па рыторыцы дзяцей 5-6 і 6-7 гадоў (арганізацыя маўленчых зносін, удасканаленне навыкаў вуснага маўлення, этыка маўленчай камунікацыі); развіццё ў студэнтаў аналітычных і прагнастычных уменняў, аратарскіх і дыскусійных навыкаў.

**Ю.В.ЕМЕЛЬЯИЕИКО**
Республика Беларусь, г. Минск, УО «БГПУ им. М.Танка»

## ДЕВИАИТИОЕ ПОВЕДЕИИЕ КАК ОДНО ИЗ ПРОЯВЛЕИИЙ ПСИХОЛОГИЧЕСКОЙ ЗАЩИТЫ У ПОДРОСТКОВ

Являясь одим из важнейщих этапов взросления, подростковый возраст характеризуется кардииальными измененииямн в развитии личности. Социальная ситуация развития подростков обусловлена наличием устойчивого стремления к независимости, самостоятельной жизни, формированием приоритетности эмоционально-личностного общения со сверстниками. Однако сами подростки и их социальное окружение зачастую психологически и функционально не готовы к происходящим изменениям, что определяет специфику протекания возрастного кризиса.

Физиологические новообразования подросткового возраста, включающие интенсивный физический рост, перестройку системы регуляции деятельности, опосредуют формирование нового « физического Я», развитие самосознания на основе понимания и переживания особенностей физических изменений и, особенно, полового созревания. Развитие подростков также характеризуется значимыми психологическими новообразованиями, включающими возможности сознательной регуляцин позиавательных процессов: развитие Я-концепции, половую идентификацию, появление чувства взрослости и притязаннй на признание, развитие противоречивости мотивов, состояний, ценностных ориентаций и поведения.

Для подростков наиболее значимыми являются потребности в свободе и автономии, в признании и самоопределеиии, в успехе и эффективности. Нереализация данных групп потребностей может привести к активизации специфических защитных механизмов и трансформации нормативного говедения в девиантное (нарушение норм, рекомендаций, формирование асоциальных форм реагирования и специфических поведенческих стратегий). Девиантное поведение может формироваться на основе иска-